ВІЦЕБСКІ ГАРАДСКІ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

Аддзел жыллёва-камунальнай гаспадаркі

07.09.2023 г.
№ Кол-09942300001794

Аб разглядзе звароту

Ваш зварот, які паступіў у камітэт дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці, разгледжаны аддзелам жыллёва-камунальнай гаспадаркі Віцебскага гарадскога выканаўчага камітэта з выхадам на месца.

Асфальтабетоннае пакрыццё праезнай часткі вуліцы Акдэміка Паўлава мае значны фактычны знос, але прыдатнае для далейшай эксплуатацыі.

Дзяржаўным прадпрыемствам «Гардармост» на пастаяннай аснове лакальна выконваюцца работы па ямачным рамонце асфальтабетоннага пакрыцця на вуліцы Акадэміка Паўлава.

Пералік вуліц горада Віцебска, якія падлягаюць бягучаму рамонту вулічна-дарожнай сеткі ў 2023 годзе, сфарміраваны. Работы па замене асфальтабетоннага пакрыцця на праезнай частцы і тратуары вуліцы Акадэміка Паўлава выканаць у 2023 годзе немагчыма.

Пры фарміраванні пераліку вуліц на 2024 год плануецца разгледзець пытанне ўключэння названай вуліцы на выкананне работ па бягучаму рамонту асфальтабетоннага пакрыцця праезнай часткі і тратуара.

Падстаў для прыцягнення вінаватых асоб няма.

У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 15 кастрычніка 2007 г. № 498 «Аб дадатковых мерах па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб» гэты адказ можа быць абскарджаны ў галоўнае ўпраўленне жыллёва-камунальнай гаспадаркі Віцебскага аблвыканкама (г. Віцебск, вул. Праўды , д. 38А).

Галоўны спецыяліст аддзела жыллёва-камунальнай гаспадаркі А.А.Грамузаў

480860